ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1988 г.
ЧАЦВЕР
19
МАЯ
№ 17 (1575)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

У наступным нумары чытайце

НАВІНУ ПАЧУЦЬ ПАСПЕЛІ? «БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ» ЦЯПЕР БУДЗЕ ВЫХОДЗІЦЬ ТОЛЬКІ ПА ВЯЛІКІХ СВЯТАХ! НАСТУПНЫ НУМАР — ДА ПЕРШАГА ВЕРАСНЯ, НЕ РАНЕЙ.

ЗДЗІЎЛЯЕЦЕСЯ?»А ЯК ЖА? ЧАМУ? НАШТО?» — ПЫТАЕЦЕСЯ. УСЁ ВЕЛЬМІ ПРОСТА. ЧАСАМ ХОЧАЦЦА БЫЦЬ ПАДОБНЫМІ НА ВАС, ЧЛЕНЫ РЭДКАЛЕГІЙ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ. І ТОЛЬКІ. ВІДАВОЧНА, ТАК ЖЫЦЬ ЛЯГЧЭЙ І ЗРУЧНЕЙ. ГАЛОЎНАЕ, НЕ ПАТРАБУЕ ВЯЛІКАГА КЛОПАТУ І МУКАЎ ТВОРЧАСЦІ.

На самай справе— чаму так рэдка на многіх факультэтах выходзяць насценныя газеты? Толькі да свят. Няўжо ўсе цікавыя падзеі адбываюцца ў групах толькі напярэдадні гэтых дзён? Вакол гэтых «чаму?» і «нашто?» будзе весціся гаворка на першай сустрэчы завочнага прэс-цэнтра.

Пра тое, што насценная газета (аказваецца, а вы і не ведалі) можа стаць цэнтрам аб'яднання аднадумцаў, пра тое, як зрабіць, каб шмат розных спраў (толькі паспявай расказваць) адлюстроўваліся ў газеце, пра неабходнасць працоўных рук спецкораў газеты «Беларускі універсітэт» і тое, якім бы вы хацелі ўбачыць універсітэцкі прэс-цэнтр, а таксама пра вынікі конкурсу факультэцкіх насценных газет чытайце ў матэрыяле «ЧАСЦЕЙ ЗАЗІРАЙЦЕ Ў ЛЮСТЭРКІ».

У многіх з вас выпрацавалася звычка ў пачатку тыдня наведваць камітэт камсамола, каб атрымаць неабходную інфармацыю: што, дзе, калі будзе. Між тым, магчыма, перш трэба зазірнуць у газету. А як жа на іншых факультэтах? На гэтае пытанне можна знайсці адказ на выстаўцы насценных газет, якая, спадзяёмся, пры дапамозе камітэта камсамола універсітэта ў той час, калі вы атрымаеце гэты нумар, ужо будзе арганізавана ў галоўным корпусе.

Беларускі універсітэт тэлетайп

УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА

ШМАТ ПЫТАННЯЎ

па правільнаму афармленню дысертацый заўсёды ўзнікае ў аспірантаў і саіскальнікаў. І таму іменна аб гэтым ішла размова на сустрэчы іх з прарэктарам па навуковай рабоце, прафесарам С. С. Шушкевічам. Былі закрануты праблемы арганізацыі навуковай работы маладых вучоных універсітэта. На пытанні прысутных адказалі таксама загадчыца аддзела аспірантуры БДУ Л. П. Яноўская і галоўны бухгалтар В. П. Саладуха, якія ўдзельнічалі ў сустрэчы.

З. МІХНЕВІЧ.

ТАЛЕНТАЎ НЕ ПАЗЫЧАЦЬ

нашаму універсітэту. Тут любяць і разумеюць гумар, могуць дасціпна пажартаваць, не задумваючыся, адкажуць на самае каверзнае пытанне, без цяжкасці знойдуць выхад з крытычнай, здавалася б бязвыхаднай сітуацыі. Многія з вас маглі пераканацца ў справядлівасці сказанага вышэй, пабываўшы на паўфінале гарадскога конкурсу клубаў вясёлых і знаходлівых ВНУ г. Мінска. Тут сустрэліся каманды БДУ і ІФК.

Адразу было відаць, што прадстаўнікі інстытута фізічнай культуры так проста перамогу не аддадуць. За яе патрэбна будзе змагацца. І нашы студэнты паказалі, што яны могуць весці барацьбу і перамагаць. Каманда КВЗ універсітэта выйшла ў фінал, які адбудзецца ў канцы мая.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

У РОЗНЫХ СТЫЛЯХ

ішла барацьба паміж факультэтамі за права называцца пераможцам першынства БДУ імя У. І. Леніна па плаванню. Мацнейшай аказалася каманда ФПМ. Добра выступалі спартсмены факультэта радыёфізікі і электронікі, крыху адсталі ад іх фізфакаўцы (трэцяе месца).

Лідэрамі ў асабістым першынстве ў розных стылях сталі: сярод дзяўчат — І. Лукашэвіч, І. Мурашова, Г. Шашкова (ФПМ) і Т. Лузан (геафак); у мужчын — Д. Сухамлінаў (юрфак), Д. Хрушч (фізфак), М. Анонік (мехмат).

А. ШАБАЛІНА.

АМАТАРЫ ГІТАРНАЙ МУЗЫКІ!

Для вас у ПК і Т МАЗ 28 мая арганізаваны вечар, на якім будзе гучаць гітара. Вы зможаце паслухаць выступленне дыпламанта Рэспубліканскага конкурсу В. Тарлецкага, а таксама папулярную музыку для гітары, аранжыроўкі кампазіцый ансамбля «Бітлз» у выкананні ансамбля гітарыстаў (кіраўнік І. Ціханраваў). Спяшайцеся набыць білеты ў касе палаца.

М. АНДРЭЕЎ.

ТРОХКУТНЫ РЫНГ

Няпроста? Цікава!

На філалагічным факультэце частымі гасцямі бываюць беларускія пісьменнікі. І ўсё ж гэта сустрэча была не зусім звычайнай і выклікала асаблівую цікавасць у студэнтаў. Па-першае, сама аб'ява папярэджвала, што адбудзецца не проста размова, дыялог з чытачамі, а літаратурны рынг. Па-другое, на гэты раз гасцямі былі супрацоўнікі самага папулярнага, на маю думку, зараз у Беларусі часопіса «Крыніца». Па-трэцяе, супрацоўнікі гэтыя самі па сабе людзі вельмі цікавыя і даволі вядомыя. Сярод іх былі паэт Уладзімір Някляеў і Адам Глобус. А каму з аматараў беларускай літаратуры не вядома імя крытыка Анатоля Сідарэвіча? Прынялі ўдзел у сустрэчы і члены літаратурнага аб'яднання «Узлёт» (кіраўнік А. А. Лойка), якое амаль дваццаць пяць гадоў існуе пры універсітэце. Свае творы чыталі Міхась Скобла, Славамір Адамовіч, Жанна Пахадня.

Цікавымі і няпростымі былі пытанні, якія прысутныя адрасавалі ўдзельнікам дыскусіі, і датычалі яны самых розных праблем: і нацыянальных, і літаратурных, і сацыяльных. На няпростыя пытанні нялёгка знайсці адназначны, дакладны адказ. І ўсё ж не гэта галоўнае. Галоўнае, што паміж тымі, хто задаваў пытанні, і тымі, хто на іх адказваў, было поўнае разуменне і ўзаемадавер. А гэта — лепшае сведчанне таго, што сустрэча была цікавая і карысная як для гаспадароў, так і для гасцей.

Д. НЯХАЙ,
студэнт філалагічнага факультэта.



Знаёмцеся: асістэнт кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі Іван Аляксеевіч Шалатонін.

Мікрапрацэсарныя сістэмы кіравання ў робататэхніцы. Іменна такой тэмай займаецца Іван Аляксеевіч. Вынікі яго дзейнасці відавочныя: ужо распрацавана методыка падрыхтоўкі спецыялістаў па робататэхніцы, створана тэхнічнае забеспячэнне кабінета, дзе вядзецца навучанне студэнтаў. Але галоўная работа яшчэ наперадзе.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

НА НАВУКОВАЙ ХВАЛІ

ЧАМУ ТОЛЬКІ ПЯТАЕ?

ВА ЎНІВЕРСІТЭЦЕ прайшоў другі тур алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па педагогіцы. У ім спаборнічалі каманды сямі факультэтаў, у састаў якіх уваходзілі студэнты — пераможцы першага тура, што праводзіўся на факультэтах.

...ЖУРЫ (вядучыя выкладчыкі кафедры педагогікі), здавалася, сама ўвага, сама бескампраміснасць. І таму крыху боязна было выходзіць на сцэну. Але хутка з'явілася раскаванасць і ўпэўненасць. Пачаўся першы этап — вітанне каманд. Яно павінна было адлюстроўваць тэму «Школа і перабудова». Тут можна было ўбачыць і музу гісторыі Кліо, закаваную ў ланцугі інспекцыі (гістфак), і строгіх прадстаўнікоў райана і карэспандэнта «Пражэктара перамен» (мехмат). Каманда філолагаў пабудавала сваё выступленне ў выглядзе тэлемаста. Карацей, фантазіі не было мяжы. Знайшлі тут месца гумар і сатыра, кемлівасць і ўменне рабіць правільныя вывады. Найбольш удала спалучыла ўсе гэтыя якасці каманда хімічнага факультэта. Яна і стала пераможцай першага тура.

Другі этап — конкурс эрудытаў. Студэнтам патрэбна было адказаць на два пытанні: па дыдактыцы і па праблемах перабудовы. І зноў на першае месца выйшла каманда хімікаў. Іх адказы былі найбольш поўнымі і абгрунтаванымі.

Пры правядзенні конкурсу па выкарыстанню ТСН у вучэбна-выхаваўчым працэсе каманды павінны былі паказаць фрагмент урока ці выхаваўчага мерапрыемства, дзе выкарыстоўваліся б тэхнічныя сродкі навучання. Тут удзельнікі алімпіяды прадэманстравалі сваё ўменне карыстацца кадаскопам, дыяпраектарам і г. д. Каманда фізічнага факультэта прапанавала на суд журы два фрагменты ўрока — станоўчага і адмоўнага і атрымала 3,8 бала. Такую ж высокую ацэнку заслужыла і каманда мехмата.

А потым студэнты трапілі вось у такую педагагічную сітуацыю. У класе праходзяць выбары старасты і ўсе кандыдаты на гэту пасаду дружна адмаўляюцца. Як павядзе сябе педагог у даным выпадку? Усе пытанні былі арыгінальна вырашаны камандай біяфака. Але саперні кі аказаліся мацнейшымі. Па агульных выніках першае месца ў алімпіядзе заняла каманда мехмата, другое — фізфака і хімфака. Прычым розніца балаў была мінімальнай — 0,1.

На гэтым спаборніцтвы не скончыліся. Прадстаўнікі каманд былі накіраваны на рэспубліканскую педагагічную алімпіяду. У ёй удзельнічалі Н. Паўловіч, Т. Лапаціна, У. Рагойша, І. Войніч (філфак), Т. Войцік (біяфак), А. Харлом (гістфак).

Нельга, на жаль, сказаць, што універсітэцкая каманда паказала на алімпіядзе выдатныя веды па педагогіцы. Яна заняла толькі пятае месца (усяго было дзевяць каманд). Праўда, выявілася, што нашы студэнты нядрэнна падрыхтаваны тэарэтычна. Аб гэтым сведчыць грамата за трэцяе месца ў конкурсе тэарэтычных ведаў. Усевалад Рагойша ў ліку лепшых студэнтаў будзе прадстаўляць нашу рэспубліку на Усесаюзнай алімпіядзе па педагогіцы.

Чаму ж толькі пятае месца? Здарылася так, што на яе паехалі, як кажуць, не лепшыя з лепшых. А дзе ж прадстаўнікі каманд, якія на універсітэцкай алімпіядзе занялі першае і другое месцы? Апраўданне знайшлося: у гэты час яны былі заняты на другіх мерапрыемствах. Але ці можна прыняць такі аргумент, асабліва тады, калі справа датычыць гонару універсітэта, яго прэстыжу?

І яшчэ адна акалічнасць, якую нельга абысці. На маю думку, універсітэцкую алімпіяду патрэбна праводзіць раней, з тым, каб вызначыць састаў зборнай на рэспубліканскую і ўжо загадзя пачаць яе падрыхтоўку.

А. МАРОЗАЎ,
наш няштатны карэспандэнт.

ВЕДАМ — ЯКАСЦЬ!

Нігілізм і недахоп аўдыторый

ПАМЯТАЕЦЕ, не так даўно па тэлебачанню ішла чарговая перадача «Маладзёжны цэнтр»? Вядучыя спрабавалі разам з аўдыторыяй разабрацца ў такім лёгкім, на першы погляд, пытанні: «Што такое марксізм-ленінізм?» і ў такім складаным, вельмі важным — як канкрэтна на практыцы выкарыстоўваць кожнаму з нас яго вучэнне.

Так, наспела неабходнасць павышэння аўтарытэту і ролі ў грамадскім жыцці грамадазнаўчых навук. У сваю чаргу, сутнасць задач, якія стаяць перад выкладчыкамі грамадскіх навук, заключаецца ў тым, каб навучыць студэнтаў думаць, а не прымаць у выглядзе пастулатаў гатовыя ісціны. Для сённяшняга студэнта важна не проста вывучыць асноўныя ісціны марксізму-ленінізму, але ўбачыць гэту тэорыю як вынік духоўных пошукаў чалавецтва, навучыцца аргументавана даказаць яе ў палеміцы з нашымі ідэалагічнымі праціўнікамі. Рашэнне гэтай задачы магчыма толькі тады, калі студэнты дойдуць да ісціны самастойна ў спрэчках, дыскусіях.

У рашэнні названай задачы, мы, кафедра грамадазнаўчых навук, імкнемся спалучыць навуковыя распрацоўкі з іх укараненнем у вучэбны працэс, каб у студэнтаў працэс навучання і заняткі навуковай дзейнасцю ішлі ў адзінстве. На кафедры назапашаны вопыт па актывізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў, пераадоленню фармалізму ў яе арганізацыі. На хімічным факультэце, дзе гуманітарныя навукі не з'яўляюцца прафілюючымі, добра зарэкамендавала сябе так званая «паэтапна-кантралюючая форма выканання НДРС з адным аб'ектам даследавання». Што гэта значыць? Студэнтам, якія прыступаюць да вывучэння палітэканоміі капіталізму, напрыклад, прапаноўваецца адна, актуальная дыскусійная праблема для навуковага даследавання. Розныя аспекты гэтай праблемы прадстаўлены ў тэматыцы дакладаў. Таму абмеркаванне дакладаў праходзіць жыва, пры ўдзеле і дакладчыкаў, і аўдыторыі. Да таго ж такая форма дазваляе студэнту ўвесь семестр плённа займацца даследаваннем.

Вывучэнне палітэканоміі сёння выклікае ў студэнтаў вялікую зацікаўленасць. І гэта зразумела. Бо студэнты прыродазнаўчых факультэтаў універсітэта не вывучаюць ніякіх іншых эканамічных дысцыплін, а пытанняў, якія датычаць эканамічных бакоў жыцця нашага грамадства, у іх нямала. Курс жа палітэканоміі вельмі сціслы і часта вычытаць яго ў адведзеныя гадзіны цяжка. Кафедра імкнецца да новых форм работы са студэнтамі. Здараецца, на першых занятках выкладчыкі сутыкаюцца з нігілізмам, недаверам. Таму мы вельмі вялікае значэнне надаем такім формам навучання, якія дапамагаюць развіваць цікавасць да нашай навукі, выклікаць імкненне ў студэнтаў самім знайсці свой варыянт рашэння праблем, якія наспелі. Так студэнты вучацца адстойваць свой пункт гледжання, выслухоўваць чужую думку, прымяняць свае тэарэтычныя пазнанні ў навуковай дыскусіі і ў практычным жыцці.

У сувязі са скарачэннем колькасці аўдыторных заняткаў са студэнтамі ўзрастае нагрузка на самастойную работу. А ў гэтых умовах узмацняецца роля выкладчыка ў арганізацыі самастойнай работы студэнтаў і кантролю за ёй. Вядома, што адной з функцый, якія выконваюць семінарскія заняткі, з'яўляецца кантралюючая. Таму кафедра зацікаўлена ў нетрадыцыйных формах правядзення семінараў. Гэта «прэс-канферэнцыі», спецсемінары, ігравыя семінары ў форме КВЗ, калёквіумы і інш.

Шукаем і другія формы. Кафедрай арганізоўваюцца экскурсіі на прадпрыемствы Мінска, а зараз вырашаецца пытанне аб вызначэнні базавага прадпрыемства, дзе б можна было праводзіць заняткі, напрыклад, па тэме «Гасразлік» разам са спецыялістамі гэтага прадпрыемства. Пачатак ужо ёсць. Так, выкладчыцай М. Л. Фірсанавай праводзіліся такія заняткі на скургалантарэйнай фабрыцы імя В. В. Куйбышава са студэнтамі фізічнага факультэта, дзе актыўна абмяркоўваліся пытанні работы прадпрыемства ва ўмовах дзяржпрыёмкі, пераходу на гасразлік.

Ёсць, зразумела, і складанасці. Мы імкнемся індывідуалізаваць работу са студэнтамі, але, на жаль, няма для гэтага ўмоў — недахоп аўдыторый, загружанасць студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў лабараторнымі заняткамі. Ці нельга тут выкарыстаць вопыт сацыялістычных краін? Напрыклад, змяніць рэжым працы універсітэта, калі працягласць лекцыі і семінарскай гадзіны складаюць 75 мінут (без перапынку). Гэта дало б магчымасць атрымаць рэзерв часу — каля гадзіны 40 мінут у канцы кожнай змены. Вядома ўсім таксама і праблема з адсутнасцю вучэбнай літаратуры. Мяркуем, што хаця б універсітэтам краіны належала б прадастаўіць права выдаваць падручнікі па грамадскіх дысцыплінах. Акрамя таго, нават з друкаваннем тых матэрыялаў, якія мы можам выдаваць, у нас таксама існуюць праблемы ў сувязі з адсутнасцю размнажальнай тэхнікі. Без вырашэння гэтых пытанняў вельмі цяжка будаваць індывідуальную работу са студэнтамі.

М. БАЗЫЛЕЎ,
загадчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.

АНКЕТА СТУДЭНТА

Камітэт камсамола БДУ, рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» прапануюць вам прыняць удзел у абмеркаванні арганізацыі студэнцкага дыскусійна-інфармацыйнага клуба. Вашы думкі і пажаданні будуць улічвацца пры складанні плана работы клуба. Удзельнікі клуба плануюць абмеркаваць праблемы, якія ўзнікаюць у маладзёжным асяроддзі, весці калектыўны пошук адказаў на актуальныя пытанні сучаснасці.

1. Які факультэт Вы прадстаўляеце?

.....

2. Ваш пол .....

3. Узрост .....

4. Як Вы ацэньваеце стан інфармаванасці моладзі зараз?

а) па пытаннях тэорыі і практыкі марксізму-ленінізму 1 2 3 (1 — здавальняюча; 2 — нездавальняюча; 3 — цяжка адказаць)

б) аб ходзе перабудовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця 1 2 3

в) аб дзейнасці нефармальных маладзёжных аб'яднанняў 1 2 3

г) аб так званых «белых плямах» у гісторыі 1 2 3

д) аб рэлігіі і цэркві ў СССР 1 2 3

е) па пытаннях міжнародных адносін 1 2 3

5. Ці задавальняе Вас узровень зносін у студэнцкім, маладзёжным асяроддзі?
— задавальняе
— не задавальняе
— цяжка адказаць

6. Ці ўзнікае ў Вас патрэба падзяліцца сваімі думкамі са спецыялістамі (кампетэнтнымі людзьмі)?
— узнікае часта
— узнікае рэдка
— не ўзнікае
— цяжка адказаць

7. Якія палітычныя і сацыяльна-эканамічныя праблемы цікавяць асабіста Вас?

.....

.....

.....

8. З кім са спецыялістаў нашай рэспублікі Вы хацелі б сустрэцца?

.....

.....

.....

МАТЭМАТЫЧНЫ ЭЦЮД



Алгебрай гармонію паверыць... Фота С. ПАЛЕШУКА.

ТАК СЭРЦА ГАВОРЫЦЬ

Мір дому твайму

ЗА МІР, як і за шчасце, патрэбна змагацца. Кожны выбірае свае формы гэтай барацьбы. Алег Захараў, дзевяцікласнік 69-й мінскай школы, не быў выключэннем.

...Праўду кажуць: бяда адна не прыходзіць. Алег ніколі не думаў, што за год атрымае два пераломы. Ну і напакутаваўся: мала таго, што боль нясцерпны, дык і ў школу хадзіць нельга, а пра спорт і казаць няма чаго. Бабуля (яго любімая бабуля) супакойвала, як магла. А аднойчы (Алег памятае гэта вельмі добра) прынесла такую радасную навіну! Аказваецца, страхавое агенцтва запрашае яго атрымаць сто рублёў. Радасці не было канца: нарэшце збудзецца яго запаветная мара, і ён зможа купіць такія жаданыя джынсы. Але...

Аднойчы бабуля нечакана прапанавала пералічыць атрыманыя грошы ў Фонд міру. Спачатку ўнук разгубіўся: «А джынсы?! Ды і як паглядзяць на гэты яго ўчынак сябры?» Сапраўды, боязь Алега не была беспадстаўнай. На жаль, многія лічылі яго дзіваком. І зноў на дапамогу прыйшла бабуля:

— Тут, унучак, ніхто табе не параіць. Мір — што можа быць даражэй за яго! Гэта павінна стаць патрэбай твайго сэрца.

Так Алег Захараў у сям'і Бяляевых стаў першым укладчыкам у Фонд міру. Яго ўзнос быў хоць невялікі, затое зрабіў гэта ён свядома, ад чыстага сэрца.

— Унука пераканала, што быць барацьбітом за мір — пачэсна, а я — пыталася сама ў сябе,— успамінае Г. М. Бяляева.— Што зрабіла я? Страшэнным ураганам пранеслася па зямлі вайна. Колькі ахвяр, пакалечаных лёсаў! Мой муж Аляксандр Канстанцінавіч вызваляў ад акупантаў Беларусь, і каб не вайна, не ляжаў бы ён сёння, прыкуты да ложка з-за раненя і кантузіі. А дзеці! Колькі іх, галодных і халодных сірот засталося! І так усюды, на ўсёй планеце. Таму няма сёння ў чалавецтва больш высакароднай і важнай задачы, чым абараніць мір, выратаваць яго ад пагрозы ядзернай катастрофы. Маё рашэнне было цвёрдым: кожны год пералічваць грошы ў Фонд міру. Стараюся заўсёды рабіць гэта напярэдадні Дня абароны дзяцей — 1 чэрвеня.

Галіна Мікалаеўна Бяляева ўжо больш за дваццаць гадоў працуе на вылічальным цэнтры БДУ імя У. І. Леніна. І ўсе гэтыя гады яна адна з актыўных барацьбітоў за мір. А па-сапраўднаму пазнала цану міру ў час вайны, калі радавалася кожнаму пражытаму дню, кожнай гадзіне, мінуце. І потым, калі стала жонкай ваеннага.

Яшчэ ў тыя далёкія пасляваенныя гады жанчына пачала займацца грамадскай работай — была членам жаночага савета часці. У работу ўкладвала душу, усё рабіла шчыра, з натхненнем. Галіна Мікалаеўна з гонарам паказвае аматарскія фотаздымкі. Вось яна на сцэне з сябрамі, а тут выконвае сольны нумар мастацкай самадзейнасці (дарэчы, у яе нават грамата ёсць за выкананне індывідуальных нумароў). А гэта яе роля ў спектаклі.

— Ці пазналі? — пытаецца.

На мяне глядзела маладая, зусім незнаёмая дзяўчына: прыгожая, стройная...

— Так-так, не пазнаць, пастарэла,— працягвае Галіна Мікалаеўна.— Гады бяруць сваё. Тады здавалася, што такой маладой і энергічнай буду заўсёды.

Тут я дазволіла сабе не пагадзіцца са сваёй субяседніцай, бо энергіі ў яе — маладыя можа пазайздросціць. А колькі планаў, задумак. Знаёмыя часта жартуюць:

— Зноў ты, Мікалаеўна, са сваімі дзівацтвамі. І калі толькі ўгамонішся.

Але яна не крыўдзіцца, бо многія яе ўчынкі не кожны можа зразумець.

Неяк зайшла Г. М. Бяляева ў СШ № 69, дзе вучыцца ўнук. У вочы кінуўся плакат, які вісеў насупраць уваходу, на процілеглай сцяне. На ім вялікімі літарамі было напісана: «Дапаможам дзецям Афганістана спартыўным інвентаром!» Гэтыя простыя словы кранулі яе, маці і бабулю, за самае сэрца. Доўга не думаючы, Галіна Мікалаеўна пабегла ў магазін і купіла мяч і ракеткі.

А дапамога дзецям Нікарагуа! Тады ў сям'і вырашылі сабрацца разам, каб не пералічваць пакрысе. Давалі, хто колькі мог. Сума атрымалася не такая ўжо і малая — 400 рублёў. Да перавода зрабілі прыпіску, якая сведчыла, што грошы прызначаліся для маленькіх жыхароў Нікарагуа.

— Магчыма, грошы, якія наша сям'я пераводзіць у Фонд міру, выратуюць некага ад голаду, а можа на іх будуць куплены медыкаменты,— разважае Г. М. Бяляева.— Я рада, што мяне разумеюць мае дзеці, унукі, што дабрабыт не зачыніў іх душы, не зрабіў чэрствымі, абыякавымі да нечага няшчасця. Яны гэтак жа шчыра адгукаюцца на чужы боль, як і на свой, гэтак жа блізка да сэрца прымаюць няшчасце незнаёмага чалавека, як перажывалі б за роднага. Мой малодшы ўнук аднойчы нават здзівіў мяне. Прыходзіць напярэдадні свайго дня нараджэння дамоў і гаворыць: «Бабуля, не купляй мне падарунак. Калі можна, падары грошы, я хачу пералічыць іх у Фонд міру». Паверце, я шчыра парадавалася яго душэўнаму парыву. Як прыемна ўсведамляць, што зерне, якое ты пасеяў, прарасло добрымі ўчынкамі.

А сее гэта зерне дабраты Галіна Мікалаеўна не толькі ў сэрцах сваіх унукаў. Хаця не, гэтых яна таксама лічыць сваімі. Ды і яны называюць яе «наша бабуля» і вельмі сумуюць, калі не бачаць тыдзень-другі. Яны — гэта 240 хлопчыкаў і дзяўчынак з дзіцячага дома, што ў горадзе Валожыне. Калі прыязджае да іх Галіна Мікалаеўна, ведаюць, што знойдзе, як кажуць, падыход да кожнага. Ды і справай цікавай зойме. Дзяўчынкі, тыя любяць кухарыць, адразу відаць — будучыя гаспадыні. Хлопчыкам прапануе новыя ўзоры для выпальвання ці разьбы па дрэву. У яе заўсёды і матэрыял з сабою, і інструмент.

— Ужо тыдні тры не была,— заклапочана гаворыць Галіна Мікалаеўна.— Як яны там без мяне? Асабліва хвалююся за Лявонку. Ён заўсёды вельмі сумуе, калі ад'язджаю дамоў. На канікулы хачу ўзяць яго да сябе.

Ведаеце, як я вырашыла паехаць у дзіцячы дом? Неяк у «Знамени юности» прачытала артыкул «Я — нічый». Ён вельмі ўразіў мяне. І вось зараз гэтыя словы: «Я — нічый» я чытаю ў вачах сваіх маленькіх сяброў. Як ім хочацца ўтульнасці, цяпла, а галоўнае — пяшчоты. Мацярынскай пяшчоты. Ніхто не заменіць яе. Я гэта разумею. І ўсё ж стараюся хоць крыху напоўніць іх жыццё цяплом і святлом. Калі еду да іх, прывожу гасцінцы, і абавязкова кожнаму. Часта бяру білеты ў тэатр. У гэты дзень таксама пяку для дзяцей розныя прысмакі.

Слухаючы расказ Галіны Мікалаеўны, думала аб тым, якое добрае, шчырае сэрца ў гэтай жанчыны. А душэўная дабрата, самаахвяраванне, як вядома, заўсёды цаніліся ў нашых людзей вышэй за ўсё. Нездарма выхаванцы валожынскага дзіцячага дома падарылі Г. М. Бяляевай настольную лямпу з пажаданнем: «Няхай ваша жыццё будзе такім жа светлым, як святло гэтай лямпы!».

Не памылюся, калі скажу, што святло яе душы саграе людзей, робіць іх па-сапраўднаму шчаслівымі.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

НЕ КІДАЦЬ СЛОЎ НА ВЕЦЕР

З КАНДЫДАТАМ філасофскіх навук А. А. Кругловым мы сустрэліся ў чытальнай зале універсітэцкай бібліятэкі. Па словах Анатоля Агапеевіча, ён праводзіць тут большую частку свайго вольнага часу: рыхтуецца да лекцый, знаёміцца з новай літаратурай, дакументамі партыі і ўрада, чытае газеты і часопісы. Усё гэта яму вельмі неабходна, бо ён павінен добра арыентавацца ў падзеях, якія адбываюцца ў нашай краіне і за мяжой. Без гэтага ў лектарскай рабоце абысціся нельга.

Членам таварыства «Веды» ён стаў яшчэ ў 1964 годзе. Работа нялёгкая, і лектарамі становяцца не выпадковыя людзі, а тыя, хто, як кажуць, валодае аратарскімі здольнасцямі. Так-так, не пасміхайцеся. Вы былі калі-небудзь на лекцыі, калі прысутныя, пакінуўшы залу, адзін у аднаго перапытваюць: «Паслухай, пра што ён гаварыў? Ну і дыкцыя! Можа ён і ведае што, але ж гаворыць, нічога не зразумееш».

Рыхтуючыся да інтэрв'ю, я загадзя запісала ў блакнот некалькі пытанняў, якія звычайна задаюць лектарам. Але, паразмаўляўшы з А. А. Кругловым, забыла і пра свой блакнот, і пра пытанні. Перада мной быў не проста чалавек, у якога я павінна была ўзяць інтэрв'ю, а вельмі цікавы і кампетэнтны субяседнік.

— У першую чаргу (я лічу гэта галоўнай якасцю) высокім прафесіяналізмам. Невуцтва, некампетэнтнасць — вось прычыны многіх нашых бед. Чаму зараз усе чытаюць «Дружбу народов», «Новый мир», чаму такі папулярны В. Пікуль? Таму, што там мы, па сутнасці, адкрываем для сябе гісторыю, якую, як аказалася, амаль не ведаем.

Анатоль Агапеевіч гаворыць, а я ўспамінаю размову з адным з яго слухачоў. На маё пытанне аб найбольш характэрных рысах лектара Круглова ён адказаў:

— Ну, выдатнае веданне таго, аб чым расказвае — гэта само сабой зразумела. Я б хацеў адзначыць яго талент педагога. Ён ніколі не навязвае іншым свой пункт гледжання. Калі патрэбна чалавека ў чым-небудзь пераканаць, то робіць лектар гэта вельмі тактоўна.

— Анатоль Агапеевіч, як правіла, лекцыі чытаюцца трыма спосабамі: адны проста прачытваюць загадзя падрыхтаваныя запісы, другія вучаць лекцыю напамяць, трэція будуюць сваё выступленне ў форме жывой размовы з аўдыторыяй. Якім метадам карыстаецеся вы?

— Безумоўна, трэцім. Лектар павінен бачыць жывыя, зацікаўленыя вочы сваіх слухачоў. А калі, падняўшы галаву, сустракаеш абыякавы погляд, значыць, цябе не разумеюць, нечага ты не ўлічыў, не дапрацаваў, нешта прапусціў і твая лекцыя не кранае прысутных, не даходзіць да іх свядомасці. Адзначу, што я дазваляю, калі тэма лекцыі не цікавіць каго-небудзь, не прысутнічаць на ёй.

Трэба заўважыць, што слухачы Анатоля Агапеевіча рэдка карыстаюцца гэтым правам. Яго лекцый не пакідаюць, бо А. А. Круглоў заўсёды ўмее заваяваць увагу аўдыторыі, хаця часта гэта нялёгка. Нездарма ён з'яўляецца адным з лепшых і таленавітых лекатараў таварыства «Веды». Выступае перад рознай аўдыторыяй: чытае лекцыі на прадпрыемствах горада, у ВНУ, тэхнікумах, розных арганізацыях.

У чым жа сакрэт яго лектарскага майстэрства? Магчыма, у тым, што ён не спыняецца на дасягнутым, не прытрымліваецца старых, звыклых схем, а шукае новыя прыёмы і метады чытання лекцый. Такія, якія маглі б зацікавіць слухачоў і, галоўнае, зрабіць лекцыі змястоўнымі і карыснымі.

В. РАДЗЬКО,
студэнтка факультэта журналістыкі.



Такі незвычайны веласіпед вы змаглі б убачыць у адным з такійскіх паркаў. Працяглыя падарожжы аднімаюць многа сіл. А што, калі стварыць спецыяльнае прыстасаванне ў выглядзе рухавіка ўнутранага згарання з прапелерам на спіне? Ці, падобна вынаходнікам фірмы «Хонда мотарз», сабраць з дэталяў старых машын загадкавы аўтамабіль?

Магчыма, зацікавіць кагосьці з вас «Трыдэм» — сродак перамяшчэння ўмельцаў з Фюрстэнвальдэ (ГДР)? А калі падабаецца вам утульнасць і камфорт, накіроўвайцеся ў Прагу, на выстаўку міні-жалезных дарог.

Хутка лета. Як і на чым падарожнічаць — выбіраць вам самім.

Фотахроніка ТАСС.



Гуляючы з канструктарам

Многа гадоў выкладчыкі фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна праводзяць заняткі са школьнікамі восьмых-дзесятых класаў г. Мінска і г. Дзяржынска. Навучэнцаў знаёмяць з лабараторыямі асноў радыёэлектронікі, лічбавай электронікі, сістэм аўтаматызаванага фізічнага эксперыменту.

Многія наведвальнікі школы юных фізікаў мараць паступіць на факультэт і пасля яго заканчэння працаваць у школе. Гэту акалічнасць і ўлічвае ў сваёй рабоце кандыдат фізіка-матэматычных навук Віктар Мікалаевіч Наумчык. Ён знаёміць іх з лабараторыяй методыкі выкладання фізікі ў сярэдняй школе, паказвае шмат доследаў. Ёсць на факультэце і лабараторыя, дзе вывучэнне асноў радыёэлектронікі пабудавана па прынцыпу дзіцячага канструктара, а школьнікі вывучаюць матэрыял, нібы гуляючы з дапамогай электронікі.

Штогод у маі праводзіцца канферэнцыя, на якой з дакладамі па выбранай тэме выступаюць найбольш актыўныя навучэнцы. На іх думку, школа юных фізікаў дапамагла ім выбраць сабе будучую прафесію і падрыхтавацца да паступлення ў ВНУ.

М. ЯМНАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ЧЫМ ЖЫВЕШ, КАМІТЭТ?

Адваротнае расчараванню

ДОЎГІ час мяне цікавіла, што ж так прываблівае камсамольцаў да Галі Дабрынскай. І не знаходзіла патрэбных слоў. Можа тое, што Галя вясёлая, любіць жартаваць. Але не заўсёды вясёлы сакратар падабаецца ўсім без выключэння. Магчыма тое, што чалавек яна дзейны. Толькі не заўсёды і такая асоба становіцца лідэрам сярод таварышаў.

Але вось што цікава: упершыню ў сваім жыцці не сустрэла я на факультэце ніводнага чалавека, які б паскардзіўся на работу камітэта камсамола, яго сакратара. Не крытыкуюць, я пераканана, зусім не таму, што давядзецца адчуць на сабе ўвесь цяжар камсамольскай работы, а таму, што нарэшце з'явіўся на факультэце чалавек, без якога жыццё ператварылася б у існаванне.

А БЫЛО ЎСЁ даволі празаічна. У той час студэнтка другога курса Галіна Дабрынская разам з астатнімі камсамольцамі прымала ўдзел у выбарах актыву. Дэканат спыніўся на адным з другакурснікаў: зручней, што хлопец, ды і абавязкі сакратара зможа выконваць на працягу двух-трох гадоў. Толькі студэнтам гэта кандыдатура не спадабалася. Адбыўся яшчэ адзін сход. Сакратаром на ім выбралі Галю. Для самой сябе было незразумела, якім чынам. Амаль ніколі нічым не вылучалася сярод іншых. Але паспелі заўважыць няўрымслівасць і арганізаванасць, аддanасць справе і шчырасць душы Галі ў час работы адказнай за культурна-масавы сектар.

Так яна заняла пасаду, аб якой ніколі не думала. Падрыхтоўкі амаль ніякай. Што рабіць? За што брацца? Разгубілася... Звычайна як бывае? Былы сакратар абяцае дапамагаць сваёй маладой змене, абяцае, але хутка пра свае цацанкі забывае. І каб у гэты час не Галя Каспяровіч, не Галя Шчарбакова, невядома, ці стала б для факультэта Галя Дабрынская тым, кім з'яўляецца зараз.

З яе прыходам да «улады» значна цікавейшым стала камсамольскае жыццё геаграфічнага факультэта, закіпела, забурліла.

Добра выконвае свае абавязкі арганізацыйны сектар, якім кіруе Іра Карпук, культурна-масавы (Галя Каспяровіч), СНТ (Света Каська), спартыўны сектар (Сяргей Бокаў) і іншыя.

Галю, гэта вельмі добра адчуваецца, паважаюць. Зусім нядаўна праводзіліся дні геафака. Мабыць, кожны камсамолец што-небудзь рабіў для гэтага свята. І кожны прыслухоўваўся да рэдкіх, але слушных парад Галі, з нейкай апантанай радасцю браўся за даручанае. А Галя старалася даваць волю самім камсамольцам.

— У яе вельмі вытрыманы, вынослівы характар, заўсёды адносіцца да ўсіх з мяккай сяброўскай добразычлівасцю. Вызначаецца незаспакоенасцю, прагавітасцю дзеянняў, настойлівасцю, рашучасцю.

Аб гэтым гаварылі ўсе, з кім мне даводзілася размаўляць. Адзначалі і тое, што яна ўсім сэрцам хварэе за даручаную справу, хоча, каб усё было найлепшым чынам, выкарыстоўвае пры гэтым усе свае магчымасці.

Заўважыце: кожны сакратар хоча лепшага. Адкажу: але не кожны імкнецца ўсімі сіламі да гэтага, не можа, не ведае часам, як, чым заваяваць давер камсамольцаў. А Галя... Хаця б барацьбой з дэканатам за ажыццяўленне паходаў.

Гэта — адно з пытанняў, рашэнне якога даводзіцца ў прамым сэнсе выбіваць. Дзіўная рэч атрымліваецца: студэнтам геафака, якія павінны займацца вывучэннем прыроды, павышаць сваё майстэрства ў паходах, не дазваляецца паспытаць свайго хлеба. Чаму ж так? Бунтуюць студэнты: радыёфізікі могуць падарожнічаць па краіне, а географы — не. Хаця ў спісах кандыдатаў у паходы тыя, хто добра вучыцца і на каго няма ніякіх нараканняў.

— Мы ж усё роўна наганяем прапушчаныя заняткі, а паходы для нас — самая лепшая практыка!

...Але пакуль што ўсё паранейшаму. Галя Дабрынская разам са сваім камітэтам робіць усё, каб схадзіла група ў падарожжа. І выбівае. У Карпаты, Крым, на Браслаўскія азёры. І мне ўсё ж верыцца, што паход на Блакітныя азёры таксама адбудзецца. Не такія яны, каб адступіцца.

Хутка прыйдзе на Галіна месца хто-небудзь іншы. Гэты другі, магчыма, Косця Лукашоў, якога Галіна Дабрынская сама рыхтуе сабе на змену. Тут можа яшчэ запярэчыць дэканат, маўляў, неблагая кандыдатура Валодзі Лаўрыновіча. Але вось незадача: не падабаецца ён камсамольцам.

— Не хапае ў яго цярплівасці выслухаць чалавека. Ён любіць толькі сваім займацца, толькі за сябе адказваць. Не ўяўляем яго ў ролі нашага важака,— гавораць яны.

— Я пакідаю сваю работу, — сумна разважае Галя.— Так, пакідаю. Многае, канешне, удалося зрабіць. Радасна на душы ад таго, што сябры не шкадуюць, што выбралі ў свой час сакратаром мяне, але расчаравана крыху ў магчымасцях камсамольскай арганізацыі факультэта.

Шмат расчараваных.

Паказаць, даказаць адваротнае расчараванню і належыць новаму сакратару.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Ружовы ранак



Алесь БАДАК

Размова

Стукне туфлікаў пара пад вечар
Аб падлогу за шэрай сцяной.
Асцярожна адчыняцца дзверы,
І дзяўчына ўвойдзе ў пакой.

— Я гарбаты зраблю табе,
будзеш?—
Запытаю ў госці сваёй.
— З мяне сёння смяяліся людзі,
З беларускае мовы маёй.

— Ну і як ты, пакуль што
жывая?—
З весялосцю скажу напускной.—
Знаеш, розныя людзі бываюць.
Я да гэтага звыкся даўно.

Будзе жыць наша мова, і болей
Аптымізму насі ў душы.
— Замаўчы,— яна мовіць
журботна,—
Замаўчы, я прашу, замаўчы.

Апушчу на плячо яе голаў:
— Я не знаю, чым боль твой
суняць.
І падступіць пад самае горла
Цішыня,
цішыня,
цішыня.



ТРЫМАЙЦЕ ШАНС!

Я і людзі. Я і тысячы. Грамадскае меркаванне і індывідуум. Абыякавасць натоўпу — слёзы адзіночак. Як прабіць браню раўнадушша і сказаць свету іскрынку свайго, набалелага, самага шчырага і патаемнага. Як?

Ідуць гады, уносячы чысціню юнацтва, парывы самых шчырых радкоў. Самых першых. Ад іх часам адмахваемся, адзначаючы: «Несур'ёзна!»

Рубрыка «Трымайце шанс!» прапануе вам першую прыступку праяўлення сябе як паэта, пісьменніка, драматурга.

Паэзія пачутых асацыяцый

Сёння мы пазнаёмім вас з вершамі Валянціны Зановіч і Сяргея Паплаўскага. Валя вучыцца на трэцім курсе філалагічнага факультэта, за плячыма Сяргея, студэнта-першакурсніка, пакуль толькі няпоўных васемнаццаць гадоў. Аб'ядноўвае іх адно, самае неабходнае ў жыцці, — паэзія.

Я б ахарактарызаваў іх вершы так: «Паэзія пачутых асацыяцый».

Пакуль у іх гучыць юнацтва. Вельмі мала свайго, чым перабалеў, але словы, пачутыя недзе, запалі ў душу, трансфармаваліся і стварылі ўласныя радкі. Гэта самае галоўнае — свае радкі!

Валянціна ЗДАНОВІЧ

* * *

Играем роли и меняем маски,
И лишь во сне нам видится покой.
Мы с нетерпеньем ждем порой развязки,
И если есть она — становимся собой.

Мы все играем роль на сцене жизни.
Надев костюмы, налагаем грим,
Сидим то на пиру, а то на тризне,
То с нежностью, то с болью говорим.

Но гаснет свет. Снимаем грим устало
И в зеркале чужой мы видим лик.
Театр пуст. В нем сыграно немало.
Все кончено. Как страшен этот миг!

Сяргей ПАПЛАЎСКІ

* * *

О першы снег,
ты важкасцю сваёй
душу аблегчыў
і падняў настрой.
Мой сон быў ясны,
схлынуў непакой.
Я дзень вітаў,
народжаны зарой.
Я дзень вітаў,
мне парк здаваўся выспай
у шуме, гуле,
у людскім віры.
Я лашчыў дрэва,
І слязой празрыстай
цякло цяпло
ад трэснутай кары.
Мяне ўздымалі
у высі, пад аблокі
святая неруш, чысціня, пакой
І чыйсьці след,
маленькі, неглыбокі,
здаваўся мне
пакінутым табой.

АПАВЯДАННЕ

З ТЫХ, ХТО НАС ВЕДАЎ

Міраслаў ШАЙБАК

Нет, не ко мне — к соседу
Зонт прошелестел...
РАНРАН.

МАКСІМА не стане ў лютым 1987 года, але «Вячэрні Мінск» не дасць на апошняй старонцы спачувальнага паведамлення, бо Максім на той час будзе толькі часова прапісаны ў Мінску.

Я спадзяюся, што аб трагедыі я даведаюся яшчэ да пахавання. Магчыма мне затэлефануе яго сябар:

— Ты пойдзеш на пахаванне? — спытае ён.

— Не, я не магу. Ты памятаеш, мой стары дом стаяў каля могілак, дык я з таго часу не магу глядзець на пахаванні.

— А яны ўсе прыцягнуцца: рэстаўратары, выкладчыкі, кіраўнік дыплома і той, відаць, прыпаўзе і прамову будзе гаварыць, што Максім — мастак, але не ўзгадае, як з інстытута выключаў і з дыпломам колькі мучыў. Яны ўсе будуць гаварыць — Максім — мастак, а на выстаўкомах яго працы не бралі — здзекаваліся, бяздарным называлі, казалі, каб кінуў маляваць, а заўтра ўсе прыдуць і будуць гаварыць, як шкада ім хлопца.

— А ты пойдзеш? — спытаю я.

— Пайду, толькі я моўчкі пастаю, нічога нікому гаварыць не буду, ды што ім усім скажаш. Яны не паверацъ, што гэта яны Максіма давялі. Яны думаюць, што ў іх чыстае сумленне.

Мы развітаемся і доўга не будзем бачыць адзін аднаго. Але ўсё можа быць і не так.

Магчыма пасля пахавання мне затэлефануе знаёмы рэстаўратар:

— Ты ведаеш, што Максім павесіўся? — спытае ён.

— Не.

— Учора пахаванне было, я ездзіў, шкада хлопца, але што зробіш. Хварэў ён цяжка. Ты, відаць, ведаеш, што вены рэзаў? І перад апошнім праглядам у інтэрнаце так нервавaўся — месца сабе не знаходзіў.

— Я не бачыў яго болей як месяц,— пераб'ю я рэстаўратара.

— Ты ж з ім сябраваў, мне здавалася? А то і праўда, каму ён такі быў патрэбны. Хаця, не кажы — цікавыя працы ў яго былі. Але дзіўна, знешне такі стрыманы быў, выхаваны...

— Нашто ты мне гэта гаворыш?

— Я думаў, табе гэта цікава,— здзіўлена адкажа ён.

Хутчэй за ўсё рэстаўратар увогуле не пазвоніць і на пахаванні мы не ўбачымся, бо на пахаванне я так ці інакш не пайду.

Можа так здарыцца, я сустрэну на вуліцы Максіма-ву дзяўчыну, яна пазнае мяне і заплача, я паспрабую супакоіць яе, але я гэтага рабіць не ўмею і супакойваць не буду, яна сама хутка перастане плакаць, мы зойдзем у кавярню і яна раскажа, як загінуў Максім. Раскажа і заплача.

— Яго забілі,— зноў скажа яна са слязьмі.— Я ў той дзень была ў яго майстэрні, мы пасварыліся, як звычайна, мы ўвесь час толькі сварыліся, не ў гэтым справа, я хачу сказаць, там побач



нейкія мужыкі працавалі і захацелі выпіць у майстэрні, а Максім іх прагнаў і абразіў, здаецца,— апошні час ён такі змучаны быў — абарона дыплома, ты ж ведаеш. Ён і мяне прагнаў, а калі я пайшла, дык тыя мужыкі зноў там круціліся. Я яшчэ падумала, што мо нельга яго пакідаць у такім настроі і з такімі «суседзямі». Я да следчага хадзіла, але ён мне не паверыў, сказаў, што ў іх не было падстаў для забойства, абяцаў толькі знайсці тых рабочых, а мне не паверыў. Але ён не мог сам. Максім сам не мог — яна зноў заплача і мне прыйдзецца яе суцяшаць, а так бы не хацелася гэтага рабіць, захочацца проста ўстаць і пайсці.

Але магчыма мы не сустрэнемся, ці яна не захоча мяне пазнаваць і не заўважыць на вуліцы, ці проста не пазнае.

Я буду ехаць у настылым тралейбусе лютаўскім вечарам і са мною побач сядзе знаёмы выкладчык.

— А! Гэта ты? — нечакана ўзрадуецца выкладчык.

— Даўно не бачыліся,— адкажу я.

— Ты, відаць, яшчэ не ведаеш, што ў нас здарылася, я маю на ўвазе ў інстытуце? — спытае ён.

— Не.

— Ты ведаеш Максіма? Ну дык вось, яго больш няма, уяўляеш сабе — павесіўся. Ты ж яго добра ведаў? — Ён будзе гаварыць далей. — Столькі непрыемнасцей у інстытуце — усіх трасуць. Мне дык нічога, а для інстытута і яго дыпломнаму кіраўніку — столькі непрыемнасцей. Я ж Максіма таксама добра ведаў: ён мне дапамагаў у новую майстэрню пераязджаць, я сам папрасіў, ты ж ведаеш — аднаму цяжка, ён мне і дапамог. Што ў гэтым такога — усе просяць. Ён, відаць, не толькі мне дапамог — тады многім майстэрні давалі. А я хацеў табе вось пра што расказаць. Можа ты ведаеш, ён жаніцца збіраўся?

— Не, я яго даўно не бачыў,— адкажу я.

— Так, ён нікому не казаў, але гавораць, што збіраўся на гэтай, як яе прозвішча — забыўся, а яна як даведалася, што яго на перыферыю размяркоўваюць, так вяселле і адклалі. Вось як бывае. Ён перажываў праз гэта, гавораць.

Тралейбус спыніцца на чарговым прыпынку і мы разам сойдзем.

— Табе ў які бок? — спытаю я выкладчыка, ён махне рукою і мы разыдземся.

Толькі якая верагоднасць у мільённым горадзе сесці ў адзін тралейбус з канкрэтным чалавекам, якраз у лютым, калі мы працуем і жывём у розных раёнах горада.

Так ці інакш, я спадзяюся, што даведаюся ад некага з тых, хто нас ведаў, аб смерці Максіма. На пахаванне я не пайду, магчыма мне захочацца зайсці да яго ў майстэрню ў цэнтры горада.

Мне пашанцуе, і ў майстэрні ў той вечар будзе працаваць нехта з яго аднакурснікаў. Ён адчыніць мне дзверы і прапануе зайсці. Я скажу, што прыйшоў паглядзець апошнія працы Максіма.

— Тут нічога няма,— адкажа яго аднакурснік.— Ён не ў гэтай майстэрні працаваў, тут нас шмат, а ў яго на краі горада майстэрня, ён там адзін быў. Ніхто не хацеў туды — далёка ездзіць.

— Можа ты раскажаш, што там адбылося? — спытаю я.

— Яго кіраўнік дыплома знайшоў. Максім яму пазваніў і папрасіў прыехаць паглядзець працы. Пакуль той даехаў... Цяжка там яму было. Кіраўнік дыплома казаў, што не ў той аўтобус сеў і таму доўга ехаў.

— Ты думаеш, ён наўмысна, як прадчуваў?

— Не, яны памыліліся.

— Чаму яны?

— Ён не ў той аўтобус сеў, а Максім час не разлічыў. Яны ўсе здзекаваліся з яго, вось ён і вырашыў адпомсціць — пачуў, што нехта ідзе, і думаў пажартаваць, ён змучаны быў. А кіраўнік не ў той аўтобус сеў — пакуль прыехаў, Максіма не выратавалі.

Максіма не стане ў лютым 1987 года, і ў некаторых яго знаёмых застанецца некалькі яго карцін і малюнкаў.

З іншымі апавяданнямі Міраслава Шайбака вы можаце пазнаёміцца ў часопісе «Крыніца» (№ 8).

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
19 мая
Зак. 1623.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М.Г. ЗАГОРСКАЯ.